НОВЫ ПАРАДАК РЭГІСТРАЦЫІ НА ЦТ 3

ПАДАРУНКІ ДА ЮБІЛЕЮ ЖЫРОВІЦКАГА МАНАСТЫРА 4

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

2 МАЯ 2020 г. СУБОТА № 84 (29198)

УСЕ КВЕТКІ МАЯ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл ОРДА, старшыня Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі:

«Першамай — любімае свята многіх беларусаў. Сутнасць гэтага свята працы — у аб'яднанні, салідарнасці працоўных. А сёння той выпадак, калі сваю салідарнасць трэба праяўляць ў аб'яднанні намаганняў у барацьбе з распаўсюджваннем COVID-19. Федэрацыя прафсаюзаў у гэтых адносінах сфакусіравала свае магчымасці на некалькіх кірунках. Прафкамы накіроўваюць грошы на закупку ахоўных сродкаў для работнікаў прадпрыемстваў. У арганізацыях створаны касы ўзаемадапамогі. Пад асаблівай увагай і клопатам прафсаюзаў — работнікі тых галін, якія ў сілу прафесійных абавязкаў кантактуюць з вялікай колькасцю людзей і маюць павышаную рызыку захворвання. Асобным пытаннем у прафсаюзаў стаяць страхаванне і матэрыяльная падтрымка медыкаў».

КАРАТКА

- **Чэмпіянат свету па хакеі ў 2021 годзе пройдзе ў Беларусі і Латвіі.**
- Месячныя ліміты на пасылкі з-за мяжы адмяняюцца ў Беларусі з 1 мая.
- **Белстат: самая мужчынская прафесія — будаўнік, а жанчыны пераважаюць у сацсферы.**
- Краіны АПЕК+ пачалі самае маштабнае ў гісторыі скарачэнне здабычы нафты з-за пандэміі.
- **Суд Кармянскага раёна прыгаварыў паляўнічага да двух гадоў пазбаўлення волі за незаконную здабычу высакароднага аленя.**

ISSN 1990 - 763X

На слыху

«Выратавала тое, што бацьку своечасова шпіталізавалі»

Мінчанка расказала, як яе сям'я лечыцца ад каранавіруса

27-гадовая Вераніка трапіла ў лік тых, хто лечыцца ад каранавіруснай інфекцыі дома. Спачатку яна была на бальнічным з тэмпературай. Пасля таго, як у бальніцу з двухбаковай пнеўманіяй трапіў яе бацька, у дзяўчыны ўзялі тэст на COVID-19, ён аказаўся станоўчы. Яна расказала «Звяздзе», як спраўляецца з інфекцыяй, чаму тэрапеўт з паліклінікі запомніла ўсю іх сям'ю і як урачы нават без тэстаў вызначаюць «кавідных» пацыентаў.

Вераніка са сваім маладым чалавекам жыве ў кватэры разам з бацькамі.

— Першы у сям'і захварэў мой тата. Некалькі дзён трымалася высокая тэмпература, ніякіх іншых сімптомаў. Выклікалі ўрача, адправілі на бальнічны. У аўторак тэмпература ў яго паднялася да 39,7 градуса. Мама патэлефанавала ў хуткую дапамогу. Там спыталі, ці быў хтосьці з нас за мяжой. Мама адказала, што не. Фельчар параіла дадаць да прызначанага ўрачом лячэння но-шпу, і брыгада не прыязджала. Тата дачакаўся пятніцы, калі быў прызначаны прыём ва ўрача, і пайшоў у паліклініку. Там зрабілі здымак — двухбаковая пнеўманія. Урач дала накіраванне ў бальніцу і папрасіла дабірацца туды самастойна. Праўда, дома мама зноў выклікала «хуткую», і добра, што так зрабіла: накіраванне далі ў 10-ю бальніцу, але яна на той час была цалкам аддадзена для хворых на каранавірус, з непацверджаным дыягназам туды не прымалі. «Хуткая» звязвалася з дыспетчарам і ў выніку адвезла тату ў РНПЦ пульманалогіі.

СТАР. 3

Педсавет

ТЭСТ НА ПРАФЕСІЙНУЮ ПРЫДАТНАСЦЬ

Ці гатовыя настаўнікі працаваць у новых умовах?

Адзіная платформа для дыстанцыйнага навучання школьнікаў можа з'явіцца да канца года. Пра гэта ў інтэрв'ю тэлеканалу «Беларусь 1» паведаміў міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА. Між іншым, з праблемай, як вучыць дзяцей, якія не вярнуліся пасля працяглых канікул у школьныя класы, а тым больш як іх атэстоўваць, настаўнікі сутыкнуліся ўжо цяпер. Пандэмія каранавіруса зладзіла сапраўдны стрэс-тэст для беларускай сістэмы адукацыі. І першы тыдзень вучобы паказаў, што з-за адсутнасці дакладнага алгарытму дзеянняў, які так і не з'явіўся на ўзроўні кіравання, кожная ўстанова адукацыі шукае свае шляхі выхаду з сітуацыі. Мы пагутарылі з педагогамі дзвюх навучальных устаноў, якія з'яўляюцца партнёрамі праграмы «Настаўнік для Беларусі», каб даведацца, што ім удалося зрабіць, каб не пакінуць дзяцей за бортам навучальнага працэсу.

СТАР. 5

Ала ГАЛУБКОВІЧ: «Лічу, што настаўнік павінен асвойваць розныя формы камунікацыі з вучнямі і трансляцыі ім вучэбнага матэрыялу».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Усё павінна быць сумленна, прынцыпова і прыстойна»

Так Прэзідэнт абазначыў прынцыпы аказання гуманітарнай дапамогі нашай краіне

Нарада, прысвечаная гэтай тэме, адбылася напярэдадні Першамая. Кіраўнік дзяржавы абмеркаваў новую рэдакцыю адпаведнага дэкрэта. Папярэдні дакумент дзейнічае з 2015 года.

«БЕЛАРУСЬ АДКРЫТАЯ ДЛЯ ФІНАНСАВАННЯ САЦЫЯЛЬНЫХ МЭТ»

«У мэтах зніжэння нагрузкі на бюджэт па маім даручэнні ў 2018 годзе ўрад сумесна з Кіраўніцтвам справамі зацвердзіў комплекс мер па прыцягненні дапамогі, — паведаміў Прэзідэнт. — Яго рэалізацыя ўжо дала вынік: намеціўся пэўны рост такіх фінансавых паступленняў з-за мяжы. Толькі за апошнія тры гады іх агульны аб'ём склаў каля 240 мільёнаў долараў ЗША».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў актывізацыю заходніх партнёраў Беларусі — розных фондаў і асацыяцый па фінансаванні гуманітарных праектаў.

«Маю пазіцыю вы ведаеце, — сказаў ён. ***— Ні капейкі не павінна быць выдаткавана на дэструктыўную дзейнасць унутры краіны. Выкарыстанне бязвыплатнай дапамогі з-за мяжы павінна быць пад самым жорсткім кантролем!»***

Прэзідэнт нагадаў, што такі парадак атрымання і размеркавання гуманітарнай дапамогі з'явіўся пасля таго, як дзяржаўныя органы зафіксавалі фінансаванне з-за мяжы палітычных працэсаў у Беларусі. «Я палічыў, што гэта няправільна, калі палітычную дзейнасць фінансуюць з-за мяжы спонсары па лініі гуманітарнай дапамогі, і ўстанавіў пэўны парадак, сумленны і адкрыты, — дадаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі гэта гуманітарная дапамога і яна ідзе на пэўныя мэты, напрыклад на ахову здароўя, фізкультуру, спорт, чарнобыльскія праекты, — усё да капейкі павінна паступіць мэтавай аўдыторыі».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусь адкрытая для фінансавання, накіраванага на сацыяльныя мэты. «Мы гатовы даць рознага роду падатковыя льготы і прэферэнцыі на аб'ёмы гуманітарнай дапамогі. Але сродкі павінны даходзіць да канкрэтнага атрымальніка, а ні ў якім разе не «растварацца» па дарозе», — сказаў беларускі лідар.

«БЕЗ ЗАЛІШНЯГА БЮРАКРАТЫЗМУ»

На цяперашні момант траціна паступленняў не мае прамой сацыяльнай скіраванасці — частка сродкаў ідзе на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы арганізацый, аплату іх агульнагаспадарчых выдаткаў.

«Мы такую дзейнасць ільгатаваць перасталі некалькі гадоў таму. І я думаю, што нам ні ў якім разе тут не трэба нічога мяняць», — сказаў Прэзідэнт.

Раней ён даручыў выпрацаваць прапановы па ўдасканаленні дзеянняў з бязвыплатнымі фінансавымі патокамі. Работа над магчымымі карэкціроўкамі вялася на чале з кіраўніком спраў Прэзідэнта, кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта і старшынёй Камітэта дзяржаўнага кантролю. Адпаведныя задачы былі пастаўленыя таксама пры прызначэнні дырэктара Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці Ігара Кудрэвіча, якое адбылося ў канцы студзеня бягучага года.

Вынікам работы стаў праект абноўленага дэкрэта. «Асобныя яго нормы істотна мяняюць механізмы рэгістрацыі дапамогі, якія дзейнічаюць. Таму ўнесеныя прапановы патрабуюць усебаковай ацэнкі і абмеркавання», — сказаў лідар краіны.

Асноўнае патрабаванне Прэзідэнта — прапанаваны механізм прыняцця рашэнняў аб рэгістрацыі дапамогі, вызваленні яе ад падаткаабкладання і ўзгадненні мэт выкарыстання не павінен утрымліваць залішняга бюракратызму.

З УДЗЕЛАМ МЯСЦОВАЙ УЛАДЫ

Яшчэ адзін важны аспект, які абмеркавалі на нарадзе, — роля мясцовых органаў улады.

«Мясцовыя органы ўлады абавязкова трэба падключыць да гэтага пытання. І, мабыць, не перагружаючы губернатараў: з гэтым справяцца і старшыні выканкамаў на месцах, і кіраўнікі адміністрацый у буйных абласных гарадах і Мінску», — лічыць Прэзідэнт.

На парадку дня была і праблема выніковасці кантролю з боку дзяржавы за паступленнем і выкарыстаннем дапамогі.

«Меры (для прадухілення нямэтавага выкарыстання. — **«Зв.»**) павінны быць самыя жорсткія, — упэўнены Аляксандр Лукашэнка. — Калі ты атрымаў гуманітарную дапамогу (з-за мяжы, натуральна), і тыя, хто дае гэтую гуманітарную дапамогу, у асноўным жа людзі прыстойныя, — яны жадаюць, каб гэтая дапамога дайшла да адрасата. І калі гэтая дапамога, як я ўжо казаў, «раствараецца» па дарозе, — за гэта павінна быць самая жорсткая адказнасць!»

Прэзідэнт дадаў: ён ведае занепакоенасць удзельнікаў нарады, што жорсткі кантроль можа паменшыць аб'ёмы дапамогі. «Тады і не патрэбная нам такая гуманітарная дапамога. Усё павінна быць сумленна, прынцыпова і прыстойна», — падкрэсліў ён.

Ігар Кудрэвіч, дырэктар Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці, адзначыў, што ў праекце дэкрэта аб замежнай гуманітарнай дапамозе знайшлі адлюстраванне ўсе даручэнні кіраўніка дзяржавы па змяненні парадку рэгістрацыі такой дапамогі, яе вызвалення ад падаткаў, зборaў, пошлін. Ён паведаміў, што за бягучы перыяд 2020 года паступілі грошы і тавары на суму 19,8 мільёна долараў.

Марыя ДАДАЛКА,
Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

❍ У тэму:

«Да гэтай нарады праект дэкрэта прайшоў узгадненне з усімі зацікаўленымі. У цэлым падыходы ўжо былі вывераныя, але на абмеркаванні ў кіраўніка дзяржавы было падкрэслена, што неабходна вельмі ўважана падыходзіць да такой далікатнай тэмы, — сказаў пасля нарады журналістам Ігар Кудрэвіч. — Беларусь мае патрэбу ў паступленні і выкарыстанні міжнароднай дапамогі, таму ўсе падыходы павінны быць абгрунтаваныя і не выклікаць ніякіх сумненняў».

Кіраўнік Дэпартамента па гуманітарнай дзейнасці паведаміў, што Прэзідэнт падтрымаў усе падыходы, выкладзеныя ў праекце дакумента.

Новая рэдакцыя пашырае паняцце замежнай бязвыплатнай дапамогі. Калі раней пад такой разумелі грошы і тавары, якія паступілі ад замежных арганізацый атрымальнікам у Беларусі, то цяпер прапануецца замацаваць на ўзроўні нарматыўнага акта тое, што гэта ў тым ліку будуць і паслугі, работы або тавары, набытыя за грошы замежнай бязвыплатнай дапамогі, растлумачыў Ігар Кудрэвіч.

Адпаведна, змяняюцца падыходы да падаткаабкладання такой дапамогі.

«Улічваюцца інтарэсы і фізічных асоб, магчымасць іх звароту па вызваленне ад падаткаабкладання, — дадаў дырэктар дэпартамента. — З улікам пашырэння паняцця замежнай бязвыплатнай дапамогі ад падаткаў могуць быць вызваленыя і другасныя атрымальнікі такой дапамогі».

Яшчэ адзін важны раздзел, які змяняецца, датычыцца кантролю за выкарыстаннем замежнай бязвыплатнай дапамогі. У новым дэкрэце будуць пашыраныя правы мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў: яны станuць выдаваць заключэнні аб мэтазгоднасці рэалізацыі праектаў і вызваленні ад падаткаабкладання і, адпаведна, удзельнічаць у кантролі за мэтавым выкарыстаннем дапамогі.

«Роля банкаўскіх устаноў (як у мінулым дэкрэце, так і цяпер) у кантролі за паступленнем і выкарыстаннем дапамогі заключаецца ў пералічэнні сродкаў толькі на мэты, якія прадугледжаны планам мэтавага выкарыстання дапамогі», — дадаў Ігар Кудрэвіч.

Дэкрэт у новай рэдакцыі выкладзены максімальна зразумелай мовай, запэўніў ён.

Палажэнне аб парадку рэгістрацыі і выкарыстання замежнай бязвыплатнай дапамогі будзе распрацавана цягам трох месяцаў і зацверджана сумеснай пастановай Савета Міністраў і Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Беларусі.

Выключаныя валакіта і бюракратызм пры прыняцці рашэнняў аб рэгістрацыі і выкарыстанні бязвыплатнай дапамогі, падкрэсліў дырэктар дэпартамента. Будзе прадугледжана работа па прынцыпе «аднаго акна».

З улікам абмеркавання на нарадзе ў Прэзідэнта цягам двух-трох дзён дакумент будзе дапрацаваны і прадстаўлены кіраўніку дзяржавы на подпіс.

Ва ўрадзе

Дазволы працягнуты, колькасць стаянак павялічана

Саўмін пашырыў меры па прадухіленні каранавіруснай інфекцыі

Урадам унесены змяненні ў пастанову Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25 сакавіка 2020 года № 171 «Аб мерах па прадухіленні завозу і распаўсюджвання інфекцыі, выкліканай каранавірусам COVID-19».

У прыватнасці, удакладнены і пашыраны пералік пунктаў для прыпынку (стаянкі) транспартных сродкаў, якія выконваюць транзітныя аўтамабільныя перавозкі грузаў.

Акрамя таго, для беларускіх міжнародных аўтамабільных перавозчыкаў грузаў прадугледжана часовае падаўжэнне на 30 каляндарных дзён тэрмінаў дзеяння дакументаў, якія выкарыстоўваюцца пры выкананні перавозак (калі тэрмін іх дзеяння заканчваецца да 30 мая 2020 года): пасведчанняў аб дапушчэнні транспартных сродкаў міжнароднай перавозкі да перавозкі тавараў пад мытнымі пломбамі і пячаткамі; дазволаў на допуск транспартнага сродку (за выключэннем колавых трактароў, прычэпаў, паўпрычэпаў да іх) да ўдзелу ў дарожным руху; міжнародных сертыфікатаў тэхнічнага агляду транспартных сродкаў; сертыфікатаў тэхнічнага кантролю, якія выдаюцца пры пацвярджэнні адпаведнасці транспартных сродкаў тэхнічным нормам ЕКМТ.

Міністэрству замежных спраў даручана інфармаваць па дыпламатычных каналах замежныя дзяржавы аб прыняцці гэтай пастановы.

Зніжаны экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты

Беларусь з 1 мая зніжае экспартныя пошліны на нафту і нафтапрадукты, якія вывозяцца за межы мытнай тэрыторыі Еўразійскага эканамічнага саюза.

Стаўка экспартнай пошліны на сырую нафту складзе 6,8 долара за тону (раней — 52 долары).

Пошліна на прамагонны бензін зніжана з 28,6 да 3,7 долара за тону, на таварныя бензіны, лёгкія і сярэднія дыстыляты — з 15,6 да 2 долараў за тону. Такая ж пошліна ўстаноўлена ў дачыненні да дызельнага паліва, бензолу, талуолу, ксілолу, змазачных і іншых алеяў.

Раней стаўкі вывазных мытных пошлін у дачыненні да сырой нафты і асобных катэгорый тавараў, выпрацаваных з нафты, змяняліся 1 красавіка. Тады яны былі таксама зніжаны.

Варвара МАРОЗАВА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

2 мільярды чалавек могуць пазбавіцца сродкаў для існавання

Міжнародная арганізацыя працы (МАП) ацаніла наступствы пандэміі COVID-19 і прыйшла да высновы, што каля паловы працаздольнага насельніцтва планеты рызыкуе пазбавіцца сродкаў для існавання. Чакаецца, што другі квартал акажацца яшчэ больш разбуральны для занятасці, чым першы. «Мы дакладна ведаем, што ў другім квартале гэтага года сумарныя чалавека-гадзіны скароцяцца на 10,5 %, — заявіў генеральны дырэктар МАП Гай Райдэр. — Гэта эквівалентна знікненню ў сусветным маштабе 305 мільёнаў рабочых месцаў з поўнай занятасцю». Цяжэй за ўсё каранцінныя меры адаб'юцца на 2 мільярдах чалавек, занятых у нефармальным сектары эканомікі. Яны не абароненыя кантрактнымі абавязацельствамі з боку работадаўца, у той час як ва ўмовах сацыяльнага дыстанцыявання самастойна зарабляць практычна не могуць. Не лягчэй і работадаўцам: па падліках Міжнароднай арганізацыі працы, на мяжы банкруцтва ў выніку пандэміі апынулася каля 436 мільёнаў прадпрыемстваў па ўсім свеце.

У ААН заклікалі ЗША адмяніць санкцыі супраць Кубы

Амерыканскія санкцыі супраць Кубы, якія ва ўмовах пандэміі каранавіруса перашкаджаюць закупцы лекаў, медыцынскага абсталявання і прадуктаў харчавання, павінны быць адменены. З такім заклікам звярнуліся да ЗША эксперты Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Сумесную заяву падпісалі сем спецдакладчыкаў Савета ААН па правах чалавека. Яны нагадалі, што Злучаныя Штаты праігнаравалі неаднаразовыя заклікі аб зняцці санкцый, «якія падрываюць здольнасць Кубы і іншых краін эфектыўна рэагаваць на пандэмію і ратаваць жыцці». Па словах экспертаў, «у надзвычайнай сітуацыі адсутнасць жадання з боку ўрада ЗША прыпыніць санкцыі» можа ўзмацніць «велізарныя фізічныя і псіхалагічныя пакуты» пацярпелых людзей.

Названы самыя экалагічна чыстыя гарады свету



Буйная кансалтынгавая кампанія вывучыла вялікія гарады па некалькіх крытэрыях. Даследчыкі параўноўвалі, напрыклад, працэнт грамадскіх зялёных насаджэнняў, месцаў для пешых шпацыраў, узровень забруджвання паветра, спажыванне энергіі з аднаўляльных крыніц і вады на душу насельніцтва, колькасць людзей, якія карыстаюцца грамадскім транспартам, фермерскіх рынкаў. Лідарам рэйтынгу стала Вена, паведамляе Lonely Planet. Там вялікая колькасць паркаў і зон адпачынку, зручны грамадскі транспарт. Прычым палова жыхароў мае гадавы праязны і адмовілася ад асабістага аўтатранспарту, які забруджвае навакольнае асяроддзе. На другім месцы — Мюнхен, на трэцім — Берлін. Замыкаюць пяцёрку Мадрыд і Сан-Паўлу. У дзясятку таксама ўвайшлі Манчэстэр, Лісабон, Сінгапур, Амстэрдам і Вашынгтон.

Рэгістрацыя на ЦТ — праз электронныя заяву і чаргу

Прыёмная кампанія — 2020



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

2 мая ў краіне распачынаецца рэгістрацыя на цэнтралізаванае тэсціраванне. Але ў сувязі з напружанай эпідэміялагічнай сітуацыяй парадак рэгістрацыі сёлета змяніўся.

Заявы абітурыенты будуць адпраўляць на электронную пошту. Форма заявы для ўдзелу ў ЦТ (на рускай і беларускай мовах) размешчана на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў (РІКВ) па адрасе www.rikc.by.

Заява павінна быць запоўнена ў электронным выглядзе ў адпаведнасці з патрабаваннямі інструкцыі і даслана з асабістага электроннага адраса абітурыента ў перыяд з 2 мая да 1 чэрвеня (да 18.00) на адрас электроннай пошты аднаго з пунктаў рэгістрацыі абітурыентаў для ўдзелу ў ЦТ. Адрасы электроннай пошты пунктаў рэгістрацыі, куды неабходна адправіць заяву, таксама размешчаны на сайце РІКВ.

Пункт рэгістрацыі ў тэрмін не пазней за адзін рабочы дзень з моманту атрымання заявы ад абітурыента адправіць на адрас яго электроннай пошты асабісты рахунак для ўнясення платы за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ (акрамя льготнай катэгорыі грамадзян).

Абітурыент, выкарыстоўваючы асабісты рахунак, павінен да наведвання пункта рэгістрацыі ўнесці не пазней за 1 чэрвеня плату за прыём і афармленне дакументаў праз сістэму «Разлік» (АРІП). Гэта сума складае 0,1 базавай велічыні за адзін вучэбны прадмет (2,7 рубля).

Каб пазбегнуць масавага збору людзей, пункты рэгістрацыі арганізуюць папярэдні запіс (фарміруюць электронную чаргу), што дасць магчымасць вызначыць дату і час наведвання абітурыентамі пунктаў рэгістрацыі.

Пасля аплаты абітурыент павінен у прапанаваны яму час асабіста забраць пропускі, маючы пры сабе дакумент, які сведчыць яго асобу (пашпарт, від на жыхарства, пасведчанне бежанца) або даведку, якая выдаецца ў выпадку страты (крадзяжу) дакумента.

Абітурыенты, з якіх не спаганяецца плата за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ, таксама запаўняюць анкету і адпраўляюць яе на адрас электроннай пошты пункта рэгістрацыі. А пасля ў вызначаны ім час асабіста наведваюць гэты пункт, маючы пры сабе дакумент, які сведчыць асобу, а таксама дакументы, якія пацвярджаюць іх права на льготу.

Працэс рэгістрацыі для ўдзелу ў ЦТ лічыцца завершаным толькі пасля атрымання абітурыентам пропускаў.

Абітурыентам дазваляецца зарэгістравацца не больш чым на чатыры дысцыпліны. Такім чынам, у іх ёсць магчымасць «ракіроўкі» пры паступленні на роднасныя спецыяльнасці.

Пры жаданні можна памяняць прадметы для здачы на ЦТ. Калі заява адпраўлена, а рэгістрацыя яшчэ ідзе, то пра сваё рашэнне абітурыент павінен паведаміць, калі прыйдзе ў пункт рэгістрацыі. Калі пропускі ўжо на руках, то давядзецца зноў забраніраваць дату і час наведвання пункта рэгістрацыі, у якім яны былі аформленыя, і асабіста перарэгістравацца.

Выбар мовы, на якой абітурыент жадае здаваць тэсты, ажыццяўляецца яшчэ на этапе падачы заявы і рэгістрацыі на ЦТ. Заява запаўняецца ўдзельнікам ЦТ на адной з дзвюх дзяржаўных моў: беларускай ці рускай на выбар. Трэба мець на ўвазе, што пазней зона рэгістрацыі бланка адказаў будзе запаўняцца абітурыентам на той жа мове, на якой была пададзена заява пры рэгістрацыі. Сертыфікат удзельніка ЦТ таксама трэба запаўняць на той мове, на якой падавалася заява.

У кожным пункце рэгістрацыі арганізавана работа гарачай лініі для інфармацыйнай падтрымкі абітурыентаў па ўсіх пытаннях рэгістрацыі і праходжання ЦТ.

Як паведамлялася раней, у Міністэрстве адукацыі цяпер абмяркоўваецца магчымасць пераносу тэрмінаў правядзення ўступнай кампаніі. «Ва ўсякім разе, пакуль будзем назіраць за той сітуацыяй, якая разгортваецца», — паведаміў **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА.** Паводле яго слоў, плануецца збіраць у аўдыторыях менш людзей і ўзмацніць санітарную апрацоўку памяшканняў. Электронная рэгістрацыя на ЦТ таксама скіравана на тое, каб зменшыць колькасць наведванняў абітурыентамі пунктаў рэгістрацыі на ЦТ.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«Выратавала тое, што бацьку своечасова шпіталізавалі»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У бальніцы мужчына некалькі дзён знаходзіўся ў аддзяленні. Пры гэтым усе ўрачы працавалі ў поўнай ахове — у спецкасцюмах, рэспіратарах і акулярах. Першы яго тэст на COVID-19 быў адмоўны. Тым не менш трымалася высокая тэмпература, і ўрачы, западозрыўшы каранавірусную інфекцыю, перавялі яго ў рэанімацыю.

— Я мяркую, што такім чынам яны вырашылі падстрахавацца. Бо стан бацькі не пагаршаўся, — расказвае Вераніка. — Праўда, гарачка ў яго трымалася 13 дзён — у асноўным каля 38,5. Аднойчы раніцай ён напісаў нам, што ноччу ледзь не «згарэў» — так падскочыла тэмпература. Яго пракалолі, і толькі пасля гэтага яна пачала падаць. У рэанімацыі тату не падключалі да апарата штучнай вентыляцыі лёгкіх, толькі працягвалі даваць кісларод і трымалі пад кропельніцай.

Паўторны тэст у мужчыны аказаўся станоўчы. У сям'і ўпэўнены, што ён заразіўся на рабоце — працуе ў адной з будаўнічых арганізацый.

— Як толькі бацька трапіў у бальніцу, яму патэлефанавалі і паведамілі, што ён — кантакт другога ўзроўню. Яго калега доўга кашляў, потым пайшоў на бальнічны, з паліклінікі яго забрала «хуткая». А бацька з ім кантактаваў.

Пасля станоўчага тэсту мужчыну адразу перавялі ў інфекцыйную бальніцу.

— На той час у СМІ было шмат інфармацыі, нібыта ў бальніцах няма месцаў. А тата некалькі першых дзён быў адзін у трохмеснай палаце, — кажа Вераніка.

Цяпер ён працягвае лячэнне ў інфекцыйнай бальніцы. І, па словах дачкі, адчувае сябе добра і хоча дадому. Але ўрачы пакуль не спяшаюцца з выпіскай.

— Да выхадных урач казаў, што на здымку яшчэ ёсць прыкметы пнеўманіі. Пасля выхадных зноў зрабілі здымак і не адпусцілі — сказалі, што яшчэ трэба падлячыцца некалькі дзён.

Ад бацькі, пакуль той знаходзіўся дома, заразіліся і Вераніка, і яе маці.

— У панядзелак участковы ўрач прыходзіла да бацькі, у сераду — да мамы, а ў пятніцу выклікалі ўжо мне, — расказвае Вераніка. — Усе мы аказаліся на бальнічным. Пасля таго як у бальніцу трапіў тата, нам у паліклініцы зрабілі здымкі. У мяне было штосьці сярэдняе паміж бранхітам і пнеўманіяй. Прызначылі два антыбіётыкі і супрацьвірусны прэпарат флустоп. На той момант у мінскіх аптэках яго ўжо не было, брат набыў у Брэсце і перадаў нам.

Каля дзевяці дзён у Веранікі трымалася павышаная тэмпература, адчуваліся стамляльнасць і ламота ў целе, дзяўчына перастала адчуваць пахі і смак ежы. Пасля станоўчага тэсту ў бацькі аналізы на каранавірус ўзялі ва ўсёй сям'і. У дзяўчыны і яе маці яны пацвердзіліся, у маладога чалавека Веранікі былі адмоўныя. Ніякіх сімптомаў у яго таксама няма.

Дзяўчына адзначае, што сімптомы хваробы не падобныя на грып ці іншую рэспіраторную інфекцыю:

— Вельмі нязвыкла: ясі рыбу ці агурок — і не адчуваеш іх смаку. Разумееш толькі, салодкі ці салёны прадукт, — і ўсё. Нос быццам і дыхае, але ніякіх пахаў не адчуваеш. Гэта іншы галаўны боль, чым пры грыпе. Ламота ў целе іншая — круціць неверагодна. Нягледзячы на тое што апошнімі днямі ў мяне амаль не павышаецца тэмпература, застаецца патлівасць: нічога не робіш — і раптам рэзка спацеў. Цяжка дыхаць — я дагэтуль не магу зрабіць поўны ўдых. Па вечарах заўсёды паднімалася тэмпература, звычайна да 37,5, я яе адчувала нават без градусніка. Праз дзень у мяне возьмуць другі тэст, і я мяркую, што ён будзе яшчэ станоўчы, бо цалкам я яшчэ не аднавілася, нягледзячы на тое што хварэю ўжо 19 дзён. Смак вярнуўся, а вось нюх — пакуль не зусім: моцныя пахі я адчуваю, а вось, скажам, адчуць пах гарбаты пакуль не магу. Падняцце застаецца жоўта-аранжавага колеру — урач кажа, што лейкацыты пакуль не ў норме. У мамы, якая захварэла раней, чым я, дагэтуль трымаецца тэмпература.

Вераніка кажа, што ўчастковы доктар у паліклініцы з самага пачатку западозрыла каранавірус і дзейнічала адпаведна.

— Доктар запомніла ўсю нашу сям'ю. Апошні раз на прыёме яна сказала, што ў бацькі, хутчэй за ўсё, ілжываадмоўны тэст, і ў нас ва ўсіх каранавірусная інфекцыя, бо ўсе мы хварэем вельмі падобна. Потым тэсты толькі пацвердзілі яе здагадкі. Але ніякага дадатковага лячэння, акрамя бранхамуналу, мне ўжо не прызначалі, бо антыбіётыкі і супрацьвірусны прэпарат я прымала з самага пачатку.

Пасля станоўчага тэсту ўрач не прызначала прыёмаў, а штодзень тэлефанавала, пытала пра сімптомы і ўдакладняла, ці няма пагаршэнняў.

У пад'ездзе, дзе жыве сям'я, 20 кватэр, прычым у чатырох з іх ёсць хворыя на каранавірус, якія таксама цяпер лечацца дома. Многія працуюць у той жа будаўнічай арганізацыі, дзе і бацька Веранікі.

— Адзін з медыкаў сказаў нам, што вельмі важна, што бацьку шпіталізавалі своечасова. З гэтай інфекцыяй самае галоўнае — не згубіць час і як мага хутчэй пачаць лячэнне, — рэзюмуе Вераніка.

Алена КРАВЕЦ.

У маі павышаюцца мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі

Сярэдняя пенсія па ўзросце ў Беларусі ў лютым была роўная 446,70 руб.

У Беларусі з 1 мая павышаюцца мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, даплаты да пенсій непрацуючым пенсіянерам, якія дасягнулі пэўнага ўзросту, дапамогі па доглядзе інваліда I групы. Усе яны прывязаны да памеру бюджэту пражытачнага мінімуму.

Нагадваем, што сацыяльныя пенсіі прызначаюцца грамадзянам, якія не атрымліваюць працоўную пенсію: людзям з інвалідnасцю, у тым ліку інвалідам з дзяцінства; дзецям — у выпадку страты карміцеля; дзецям-інвалідам ва ўзросце да 18 гадоў. А таксама мужчынам у 65 гадоў, а жанчынам — у 60 гадоў, калі яны не выпрацавалі мінімальны страхавы стаж.

Новыя памеры сацыяльных пенсій:

інвалідам I групы, у тым ліку інвалідам з дзяцінства, — 271,46 руб.;

інвалідам з дзяцінства II групы — 234,44 руб.;

інвалідам II групы, дзецям у выпадку страты карміцеля — 209,76 руб.;

інвалідам III групы — 185,09 руб.;

сацыяльная пенсія па ўзросце — 123,39 руб.;

дзецям-інвалідам да 18 гадоў пры ступені страты здароўя:

першай — 197,42 руб.;

другой — 209,76 руб.;

трэцяй — 234,44 руб.;

чацвёртай — 271,46 руб.

* * *

Таксама павялічацца дапамогі па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту:

пры ажыццяўленні догляду адной асобы — 246,78 руб.;

пры ажыццяўленні догляду дзвюх і больш асоб — 296,14 руб.

* * *

Крыху павысяцца і даплаты да пенсій непрацуючым пенсіянерам, якія дасягнулі ўзросту 75 і 80 гадоў:

75 гадоў — 46,28 руб.;

80 гадоў — 61,70 руб.

Бальнічны са стапрацэнтнай аплатай

Бацькам, чыё дзіця адносіцца да кантактаў першага або другога ўзроўню па COVID-19, цяпер будуць выдаваць бальнічны ліст і выплачваць 100 % сярэднядзённага заробку.

Раней было прынята рашэнне выдаваць ім даведку аб часовай непрацаздольнасці, якая служыла дакументам, што пацвярджае вызваленне ад работы, і не падлягала аплаце.

Цяпер у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны паведамілі, што пунктам 15 Указа Прэзідэнта ад 24 красавіка 2020 года № 143 «Аб падтрымцы эканомікі» прадугледжана выплата дапамогі па часовай непрацаздольнасці асобам, што фактычна ажыццяўляюць догляд дзіцяці да дзесяці гадоў, якое наведвае ўстанову дашкольнай або агульнай сярэдняй адукацыі. Пры гэтым неабходна, каб было выканана некалькі ўмоў. У прыватнасці, паўторым, дзіця павінна быць не большае за дзесяць гадоў, а таксама мець адзін або некалькі рэспіраторных сімптомаў. Другая ўмова: на бацькоў павінна распаўсюджвацца дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне, г. зн. яны ці іх работадаўца павінны выплачваць абавязковыя страхавыя ўзносы ў фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

Як адзначаюць у Мінпрацы і сацабароны, перыяд знаходжання на лістку непрацаздольнасці па гэтым выпадку часовай непрацаздольнасці складае да 14 каляндарных дзён, памер аплаты складае 100 працэнтаў сярэднядзённага заробку з першага дня знаходжання на лістку непрацаздольнасці.

Святлана БУСЬКО.

Акцыя

ПАМЯЦЬ, ЯКАЯ ЯДНАЕ

У Магілёве аддалі даніну памяці абаронцам і вызваліцелям вобласці

Прысвечаная 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне рэспубліканская акцыя «У гонар агульнай Перамогі» адбылася на Буйніцкім полі — святым месцы для кожнага жыхара вобласці і краіны. Менавіта тут на працягу 23 дзён чырвонаармейцы і жыхары горада стрымлівалі шалёны націск наступаючай арміі вермахта і сваёй мужнасцю развеялі міф пра яе непераможнасць. Толькі за адзін дзень тут было падбіта і спалена 39 фашысцкіх танкаў і бронемашын. Ва ўрачыстай цырымоніі ўшанавання памяці герояў узялі ўдзел прадстаўнікі ўлады, ветэраны, дэпутаты, вайскоўцы, моладзь, грамадскасць.

— Пройдуць гады, зменіцца яшчэ не адно пакаленне, але ў сэрцах жыхароў Прыдняпроўскага краю захаваецца памяць аб подзвігу нашых прадзедаў, дзядоў і бацькоў, — адзначыў у сваёй прамове **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА.** — Немагчыма аддаць на забыццё тысячы спаленых вёсак, разбураных гарадоў, не схіліцца перад адвагай і гераізмам савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў. Акцыя «У гонар агульнай Перамогі» закліканая стварыць новую культуру памяці пра вайну і абараніць гістарычную праўду.

Загінулых герояў ушанавалі хвілінай маўчання, да падножжа капліцы былі ўскладзены кветкі і вянкі, а ў буйніцкім храме ў гонар Раства Іаана Прадцечы адбылася памінальная ліція.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

На паліцу

ПРА ВЫСОКАЕ І ЗЯМНОЕ

Сёлета адна з вялікіх святынь хрысціянскага свету — Жыровіцкі Свята-Успенскі стаўрапігіяльны мужчынскі манастыр — адзначае адразу два юбілеі: 550-годдзе з'яўлення абраза Жыровіцкай Маці Божай (гэту ўнікальную рэліквію прызналі цудатворнай і праваслаўная, і каталіцкая канфесіі) і паўтысячагоддзе з часу заснавання самой абіцелі. Цікавасць да знакавых дат вялікая як у Беларусі, так і далёка за межамі нашай краіны.

Маштабныя ўрачыстасці ў Жыровічах у сувязі са складанай эпідэміялагічнай сітуацыяй давялося адкласці — хутчэй за ўсё, іх перанясуць на некалькі месяцаў. Але падарункі да свайго свята адзін з найстарэйшых праваслаўных цэнтраў Беларусі ўсё ж атрымае — прынамсі, іх падрыхтавалі некалькі айчынных выдавецтваў.

Як нядаўна ўжо расказвала «Звязда», энцыклапедычны даведнік **«Жыровічы: пад святым пакровам»** тыражом 1000 асобнікаў убачыць свет у «Беларускай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі». Выданне, укладальнікам якога стаў прарэктар па навуковай рабоце Мінскай духоўнай семінарыі і Мінскай духоўнай акадэміі Аляксандр Слесараў, утрымлівае разнастайную інфармацыю пра гісторыю і сучаснае жыццё абіцелі і аграгарадка Жыровічы, пра цудадзейны абраз Божай Маці, пра лёсы царкоўных дзеячаў, чыя духоўна-асветніцкая праца была звязаная з манастыром, пра царкоўна-археалагічны музей Мінскай духоўнай семінарыі, а таксама пра тыя помнікі культуры і мастацтва, якія ў свой час знаходзіліся ці дагэтуль захоўваюцца ў Свята-Успенскім манастыры. Напрыклад, анансуе дырэктар выдавецтва Вольга Ваніна, асобныя артыкулы падрабязна раскажуць пра Жыровіцкі ірмалагіён — помнік спеўнай культуры першай паловы XVII стагоддзя, славутае Евангелле Сапегі альбо так званую Жыровіцкую «Энцыклапедыю» XVI стагоддзя — унікальны рукапісны зборнік, па сутнасці, першае даведачна-энцыклапедычнае выданне на тэрыторыі Беларусі.

Дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК.

Аўтарамі больш чым 180 артыкулаў, якія ўвайшлі ў зборнік, выступілі вядомыя рэлігійныя дзеячы, даследчыкі царкоўнай гісторыі, мастацтвазнаўцы. Асноўная мова энцыклапедыі — беларуская, але частка артыкулаў прадубляваная на рускай і англійскай мовах. Кніга аздоблена вялікай колькасцю ілюстрацый.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» раскрывае тэму па-свойму — праз кнігу паэзіі **«Святло з Жыровіч».** Яе аўтар, чалавек надзвычай цікавага і пакручастага лёсу, — сын вядомага скульптара, былы выкладчык музыкі, філосаф, публіцыст Алег Бембель, ён жа **паэт Зніч,** які ўжо шмат гадоў непарыўна звязаны са святым месцам. Ён прайшоў шлях ад смяротна хворага паслушніка Алега да інака Мікалая і манаха Іаана, насельніка Свята-Успенскага Жыровіцкага манастыра, і з цягам часу менавіта вера стала адным з асноўных матываў ягонай творчасці. Хоць тэма веры і духоўнасці, сцвярджае дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак, наогул уласцівая для беларускай літаратуры, нават нягледзячы на даволі працяглы перыяд бязбожнасці, калі ўсё, што датычылася рэлігіі, Бога, выкрэслівала цэнзура. У якасці доказу выдавец прыводзіць анталогію беларускай хрысціянскай паэзіі, над якой «Мастацкая літаратура» працуе з нядаўняга часу, — у ёй налічваецца больш за 100 імёнаў аўтараў, ад класікаў (хто ж не згадае «Маю малітву» Янкі Купалы, якая дзякуючы кампазітару Алегу Молчану і «Песнярам» стала помнікам не толькі літаратурным, але і музычным) да сучаснікаў. А значыць, паэтычныя развагі пра веру і духоўнасць знойдуць свайго чытача і цяпер.

Кніга вядомага беларускага мастацтвазнаўца, музейшчыка **Аляксандра Ярашэвіча «Жыровіцкі Свята-Успенскі манастыр»** ужо выходзіла ў выдавецтве «Беларусь» больш за 10 гадоў таму. Але сёлета яно было практычна цалкам абноўлена, у прыватнасці, наноў сабралі ілюстрацыйны матэрыял, які адлюстроўвае інтэр'еры і дэкор манастыра, паказвае від на Жыровічы з вышыні птушынага палёту і ў дэталях разглядае абразы... Асаблівасць кнігі, як кажа спецыяліст выдавецтва Анжэла Садоўская, у тым, што аўтар абапіраўся на навуковыя факты і даследаванні, але пры гэтым сціслa, ёмістa і даступна для самага шырокага кола чытачоў распавёў гісторыю Жыровіцкага манастыра з часу заснавання да нашых дзён. Гэты аповед на трох мовах — беларускай, рускай і англійскай — маляўніча афармлены ў падарункавым выданні і адрасаваны шматлікім паломнікам, якія штогод прыязджаюць у абіцель.

Другая кніга, якую рыхтуе выдавецтва «Беларусь» да юбілею хрысціянскай святыні, — **«Цяпло Жыровіцкай святыні»** вядомага слонімскага краязнаўца, журналіста і пісьменніка **Сяргея Чыгрына.** Аўтар навукова-папулярнага даследавання шмат часу правёў у архівах Украіны, Польшчы і Літвы, збіраючы малавядомыя факты не толькі пра манастыр, але і наогул пра Слонімшчыну, гісторыю сваёй малой радзімы і яе славутых ураджэнцаў. Як плануецца, гэтая кніга ўбачыць свет у канцы мая.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

«РАСНАФТА» ВЫВУЧЫЦЬ... КЛЮЧАВЫХ ЖЫВЁЛ АРКТЫКІ

Некранутая прырода Арктыкі захоўвае мноства таямніц, якія чалавеку яшчэ трэба будзе разгадаць. Але зрабіць гэта далікатна, бо стаіць задача захаваць такую ж далікатную экасістэму Арктыкі, яе біялагічную разнастайнасць.

Нафтавая кампанія «Раснафта» пачала рэалізацыю праграмы ацэнкі ўстойлівасці арктычных экасістэм на падставе даследавання ключавых відаў арктычных жывёл: белага мядзведзя, атлантычнага маржа, дзікага паўночнага аленя і белай чайкі. У перыяд да 2023 года ўключна кампанія правядзе 8 экспедыцый на мора Лапцевых, Баранцава і Карскае моры.

Падчас анлайн-прэзентацыі праграмы **Міхаіл ЛЯВОНЦЬЕЎ, прэс-сакратар «Раснафты»**, паведаміў: «Стратэгія кампаніі нацэлена на максімальна беражлівае стаўленне да навакольнага асяроддзя, захаванне біялагічнай разнастайнасці». Маштаб маючых адбыцца даследаванняў стане беспрэцэдэнтным у гісторыі вывучэння рэгіёна. Навуковая работа ў такіх аб'ёмах раней у Арктыцы не ажыццяўлялася.

Так, напрыклад, апошнія глабальныя назіранні паўночных аленяў праводзіліся больш чым трыццаць гадоў таму. Сёння патрэбныя новыя веды аб стане папуляцыі.

«Раснафта» рэалізуе праграму захавання біялагічнай разнастайнасці Арктыкі, клапоцячыся пра яе бяспечнае асваенне ў далейшым і захаванне яе ўнікальных экасістэм. Праграма прадугледжвае даследаванні марскіх экасістэм, назіранні за відамі жывёл, якія з'яўляюцца індыкатарамі экасістэмы Арктыкі, таксама ўключае навукова абгрунтаваную ацэнку адчувальнасці тэрыторыі і месцаў пражывання, распрацоўку рэкамендацый па арганізацыі маніторынгу стану экасістэм.

Праграма стала працягам маштабных даследаванняў белых мядзведзяў, маржоў і паўночных аленяў, выкананых «Раснафтай» у 2014–2018 гадах, па выніках якіх быў сабраны і сістэматызаваны ўнікальны навуковы матэрыял аб сучасным стане жывёл, што жывуць у Арктыцы.

Станіслаў ЗАЛАТЫ, дырэктар запаведніка «Ненецкі», падкрэслівае, што Арктыка — сапраўды ўнікальная прырода, унікальныя людзі, унікальны жывёльны свет. І задача стаіць глабальная: вывучыць і захаваць унікальную прыроду Арктыкі.

У рамках экспедыцый плануецца правесці больш за 170 гадзін авіяцыйных даследаванняў, у тым ліку пры дапамозе беспілотных лятальных апаратаў. Аэраздымка будзе праведзена на плошчы звыш 500 тысяч квадратных кіламетраў. У ходзе больш чым 200 сутак палявых назіранняў плануецца выканаць пазначэнне і кальцаванне звыш 100 асобін жывёл і птушак, адабраць больш за 1000 біялагічных узораў для наступнага лабараторнага аналізу. Пасля правядзення палявых даследаванняў аналіз атрыманых матэрыялаў будзе праводзіцца ў 10 лабараторыях краіны, у тым ліку рэгіянальных. Плануецца правесці некалькі тысяч аналізаў.

ИНН 7702420062.

ТЭСТ НА ПРАФЕСІЙНУЮ ПРЫДАТНАСЦЬ

НАВУЧЫЎСЯ САМ — НАВУЧЫ ІНШАГА!

Намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце гімназіі горада Дзяржынска Галіна МІГУРА:

— У першы тыдзень пасля заканчэння канікул на заняткі прыйшло прыкладна 30 працэнтаў ад агульнай колькасці вучняў, а ўсяго ў нашай гімназіі навучаецца каля 1170 чалавек. Пакуль што нам удаецца вытрымліваць у класах сацыяльнае дыстанцыраванне: кожны вучань сядзіць за асобным сталом. Каб дзеці з розных класаў не перасякаліся і не кантактавалі на пераменках, мы для кожнага класа прадумалі адмысловы графік праветрывання аўдыторый. І калі гімназісты на пяць хвілін выходзяць у калідор, яны там адны. Іншы клас, які таксама ў гэты момант праветрывае сваё памяшканне, можа знаходзіцца толькі ў супрацьлеглым канцы калідора на вялікай адлегласці. І ў сталоўцы вучні розных класаў не перасякаюцца паміж сабой. Харчаванне арганізавана невялікімі групамі. Мы дэталёва прадумалі ўсю гэту складаную лагістыку.

Але сёння на парадку дня востра стаіць пытанне, як вучыць дзяцей, што засталіся дома. Прызнаюся, што працяглыя канікулы мы правялі з максімальнай карысцю і скарысталіся гэтым часам для ўласнага прафесійнага развіцця. Калі стала зразумела, што эпідэміялагічная сітуацыя не палепшыцца і нават калі распачнецца вучэбны працэс, бацькі ўсё роўна не пусцяць дзяцей у школу, сталі думаць, як будзем наладжваць камунікацыю з вучнямі анлайн. Дапускалі, навучальны відэапрадукт, а мы ў яго ахвотна вучымся.

Так, усе разумеюць: адказнасць за тое, што ты робіш, шматразова ўзрасла, бо цяпер цябе ацэньваюць не толькі твае вучні ў класе, але і калегі. Вынікамі нашай працы мы таксама дзелімся на сайце Мінскага абласнога інстытута развіцця адукацыі. А на сайце нашай гімназіі ў раздзеле «Дамашняе заданне» размяшчаюцца заданні для тых, хто спрабуе не адстаць ад сваіх аднакласнікаў, хоць і не наведвае заняткі. Праўда, узнікаюць пытанні з атэстацыяй вучняў, якія не наведваюць школу. Мы асабіста гатовы іх атэстоўваць, хоць на педагогаў кладзецца дадатковая нагрузка — гэта ўсе разумеюць. Напрыклад, наша настаўніца матэматыкі прыняла па пошце адразу 38 пісьмовых работ ад вучняў. Дзеці адпраўляюць свае работы і на Google-дыск, і на электронную пошту, і па «Вайберы». Прычым у любы час сутак. Настаўніца беларускай мовы і літаратуры прыдумала, як у анлайне праверыць веданне верша на памяць: вучні чыталі яго з заплюшчанымі вачыма.

Мы папярэдне вывучалі пытанне: толькі лічаныя дзеці не маюць дома камп'ютара. І тэхнічна школьнікі падрыхтаваныя нават лепш за сваіх педагогаў. А наконт іх матывацыі да вучобы скажу вам так: я выкладаю англійскую мову, і ў групе, якая складаецца з дзевяці чалавек, не бывае такога, каб усе сумленна рыхтаваліся да заняткаў. Гэтая група — як адбітак усяго вучнёўскага грамадства. Ёсць дзеці, якія будуць выкладвацца на ўсе сто працэнтаў, але будуць і тыя, хто хітрыць і ўхіляецца ад вучобы.

Наталля ЦЕЦЯРУК: «Элементы дыстанцыйнага навучання мы будзем і далей выкарыстоўваць у сваёй рабоце. Нашы дзеці тэхнічна да гэтага падрыхтаваныя...»

Гістарычнае сэлфі. Чарлі Чаплін. Аўтар — Віка Шакаль, 6 «В» клас гімназіі Дзяржынска.

Гістарычнае сэлфі. Вынаходніцтва вакцыны ад бубоннай чумы. Аўтар — Ганна Корзун, 4 «А» клас гімназіі Дзяржынска.

што, магчыма, давядзецца арганізоўваць дыстанцыйнае навучанне, трэба быць падрыхтаванымі да любога развіцця падзей.

Якраз на канікулах фонд «Новая школа» разам з IT-кампаніяй Vizor Games і асацыяцыяй «Адукацыя для будучыні» запусцілі бясплатны пяцідзённы інтэнсіўны экспрэс-курс «Падрыхтаваныя да дыстанцыйнага навучання». Педагогаў вучылі, як праводзіць урокі дыстанцыйна, як актыўна карыстацца Zoom, Google Drive, Kahoot і Docs. Двое нашых настаўнікаў адвучыліся на курсе ў першы набор, а двое — у другі. Я таксама запісалася на расійскі вэбінар па дыстанцыйным навучанні. У нашай гімназіі дзейнічае правіла: навучыўся сам — навучы іншага. Мы ўсе вучымся адно ў аднаго. Цяпер з платформай Zoom многія з нашых педагогаў ужо на «ты». Пачалі спрабаваць здымаць фрагменты урокаў і загружаць іх у Zoom. Уявіце сабе: сядзім усе побач з камп'ютарам і вывучаем фізіку, бо ў нашага настаўніка гэтага прадмета выдатна атрымліваецца ствараць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

галоўнае — каб усе былі здаровыя! Канешне, вельмі хочацца ўжо заўтра прачнуцца і вярнуцца да ранейшага жыцця, але мы разумеем, што такое пакуль наўрад ці магчыма.

КВЭСТ І ВІРТУАЛЬНЫЯ ЭКСКУРСІІ

Ала ГАЛУБКОВІЧ, настаўніца гісторыі з гімназіі горада Дзяржынска, адна з удзельніц праграмы «Настаўнік для Беларусі»:

— Пачатак чацвёртай чвэрці двойчы адкладваўся, і я вырашыла арганізаваць для гімназістаў дыстанцыйны квэст «Гістарычныя канікулы». Цягам пяці дзён размяшчала заданні на сайце гімназіі і ў сябе ў сацыяльных сетках, бо некаторыя з маіх вучняў ёсць у мяне там у сябрах. Да ўдзелу запрашаліся навучэнцы 6—11-х класаў, але, забягаючы наперад, скажу, што сярод тых, каго зацікавіў квэст, была і вучаніца чацвёртага класа, хоць гісторыя ў пачатковай школе яшчэ не вывучаецца. Адным з заданняў было зрабіць гістарычнае сэлфі. Ад дзяцей патрабавалася цягам аднаго дня выбраць эпоху, падзею і асобу, стварыць вобраз, дэкарацыі і зрабіць фота. Ганна Корзун, вучаніца 4 класа, абрала ў якасці падзеі вынаходніцтва вакцыны ад бубоннай чумы, а ў якасці асобы — чумнога доктара.

Квэст уключаў таксама анлайн-віктарыну па гісторыі Беларусі. Затым удзельнікі знаёміліся з красэнсам — асацыятыўным ланцужком, які сумяшчае галаваломку, загадку і рэбус. У гугл-дакументе, спасылку на які я размясціла, можна было даведацца пра яго падрабязней і атрымаць заданне. Затым гімназісты гулялі са мной у марскі бой анлайн, і калі я выйгравала, то ў залежнасці ад колькасці падбітых караблёў яны атрымлівалі ад мяне пытанні па гісторыі.

Ну і апошнім заданнем было падзякаваць продкам за якое-небудзь вынаходніцтва, якое значна спрасціла наша жыццё. Дзеці дзякавалі за інтэрнэт, тэлефон, хуткасныя электрычкі, кантактныя лінзы, кнігі і гэтак далей.

Цяпер займаюся падрыхтоўкай дыстанцыйнага праекта па Вялікай Айчыннай вайне на Дзяржыншчыне, які звязаны са Steam. Калі казаць коратка, то дзеці «ходзяць» віртуальна па месцах смутку ў нашым раёне і потым з дапамогай крокамера лічаць колькасць крокаў, кіламетры, вылічваюць маштаб карты, адзначаюць усё на ёй і такім чынам пакрысе дабіраюцца да пэўнага месца. Потым пераходзяць па QR-кодзе і адказваюць на пытанні. А яшчэ робяць паштоўкі, прысвечаныя гэтым месцам.

Я лічу, што настаўнік павінен ісці ў нагу з часам, асвойваць розныя формы камунікацыі з вучнямі і трансляцыі ім вучэбнага матэрыялу. Трэба ўмець заматываваць, а сучасныя падыходы да арганізацыі навучальнага працэсу якраз дапамагаюць гэта зрабіць.

Мы з калегамі ў гімназіі паралельна вывучалі розныя інструменты для дыстанцыйнага навучання. А калі распачалася чацвёртая чвэрць, сталі ўсё гэта ўкараняць. У класах, дзе адсутнічае шмат вучняў, я праводжу ўрокі і дыстанцыйна — з дапамогай платформы Zoom. Гэта вельмі зручны інструмент, з яго дапамогай можна распытваць дзяцей вусна. Карыстаюся таксама гугл-класам, які дазваляе размяшчаць любую інфармацыю, відэаролікі, усялякія тэсты, прычым з магчымасцю праверкі заданняў.

БАЦЬКОЎСКІ СХОД АНЛАЙН

Наталля ЦЕЦЯРУК, настаўніца беларускай мовы і літаратуры з аграгарадка Павіцце Кобрынскага раёна, удзельніца праекта «Настаўнік для Беларусі»:

— З усіх школ-партнёраў праекта наша, напэўна, самая аддаленая ад сталіцы. Да ўкраінскай граніцы ўсяго сем кіламетраў, а да сталіцы — 350. І канешне, у нас ёсць свая спецыфіка. Колькасць вучняў адносна невялікая — каля 150 чалавек. І яны пачалі масава хварэць яшчэ ў лютым. Мы задумаліся: што будзем рабіць, калі ў класах увогуле не застанецца дзяцей? Ці гатовы мы іх вучыць на адлегласці?

Таму экспрэс-курс «Падрыхтаваныя да дыстанцыйнага навучання», арганізаваны фондам «Новая школа» разам з партнёрамі, аказаўся для нас вельмі актуальны. Я трапіла ў першы набор, а ў другім наборы была ўжо адным з мадэратараў і дапамагала іншым. Яшчэ падчас канікул мы апрабавалі тое, чаму навучыліся, — напрыклад, перанеслі ў анлайн нашы гурткі. Рыхтаваліся са старшакласнікамі да ЦТ. Яны нават узрадаваліся, што ўдалося сканцэнтравацца толькі на тых прадметах, якія патрабуюцца для паступлення, не адцягваючы ўвагу на іншыя. Мне асабіста вельмі зручна працаваць з дзецьмі на гугл-дыску.

Камусьці падабаецца праводзіць бацькоўскія сходы на платформе Zoom. Не сакрэт, што бацькі не вельмі жадаюць наведваць такія мерапрыемствы. Затое ахвотна ўдзельнічаюць у сходах анлайн.

Пасля канікул у нас амаль усе дзеці вярнуліся за школьныя парты. Таму цяпер неабходнасці праводзіць заняткі дыстанцыйна няма, але элементы дыстанцыйнага навучання мы будзем і далей выкарыстоўваць у сваёй рабоце. Нашы дзеці тэхнічна да гэтага падрыхтаваныя. Хоць мы і знаходзімся ў сельскай мясцовасці, але інтэрнэт з нармальнай хуткасцю ёсць ва ўсіх.

Я правяла ў раёне экспрэс-курс для калег па дыстанцыйным навучанні і хачу заўважыць, што беларускія настаўнікі — актывісты і працаголікі, якім пад сілу ўсё. Канешне, узровень лічбавай адукаванасці ва ўсіх розны. Да таго ж адна рэч — правесці ўрок у класе, а зусім іншая — дыстанцыйна: гэта іншыя метады, формы работы, кантроль. Дыстанцыйныя ўрокі павінны быць больш кароткія, яркія і дынамічныя. Але ўсе разумеюць, што гэтаму трэба вучыцца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

❍ Будзь у курсе!

Праграма «Настаўнік для Беларусі» — сумесны праект БПС-Ашчадбанка і Міністэрства адукацыі, мэта якога — прыцягнуць у школы ў невялікіх гарадах і населеных пунктах крэатыўных і неабыякавых настаўнікаў, якія хочуць і могуць прыўнесці ў сваю прафесію новыя цікавыя ідэі, умеюць спраўляцца з цяжкасцямі, захоўваючы аптымізм, імкнуцца да самаразвіцця, гатовыя да змен (у тым ліку і да пераезду на новае месца) і вераць у свае сілы.

Жорсткіх абмежаванняў для ўдзельнікаў праграмы не існуе: гэта могуць быць як навaспечаныя выпускнікі педагагічных спецыяльнасцяў, так і вопытныя настаўнікі ці нават сям'я педагогаў. Ключавой з'яўляецца наяўнасць вышэйшай адукацыі, неабавязкова профільнай (магчымая перападрыхтоўка).

Праграма адкрывае перад педагогамі ўнікальныя магчымасці для асабістага і прафесійнага росту праз летні інтэнсіў і падтрымліваючыя метадычныя мерапрыемствы. Кожны з удзельнікаў становіцца часткай прагрэсіўнай настаўніцкай супольнасці.

Немалаважнай з'яўляецца і матэрыяльная падтрымка. Акрамя заработнай платы ўдзельнікі праграмы атрымліваюць таксама стыпендыю за дадатковую нагрузку па рэалізацыі праектаў, плюс кожны з іх будзе забяспечаны ноўтбукам для зручнасці работы.

Першы крок для ўдзелу ў праграме — запаўненне анкеты на сайце teach4.by. Прыём анкет другой хвалі заканчваецца 24 мая.

УП «Торговый дом «Восточный»

извещает о проведении 04.06.2020 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

ЛОТ № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 641/С-9314 общей площадью 1 404,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Клецкий р-н, г. Клецк, ул. Кирова, 1Б. Назначение: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака; наименование: здание колбасного цеха. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 622550100002003325 площадью 0,4085 га. **Начальная цена продажи – 645 840,00 бел. руб., размер задатка – 64 584,00 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

ЛОТ № 2. Капитальное строение с инвентарным номером 642/С-11302 общей площадью 123,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Копыльский р-н, Блевчицкий с/с, д. Деречино, ул. Советская, 105А. Назначение: здание специализированное розничной торговли, наименование: магазин. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 622880402101000051 площадью 0,0490 га. **Начальная цена продажи – 9 072,00 бел. руб., размер задатка – 907,20 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.**

